2021-06,08(267,268)

# Эканамічная гісторыя Барысаўскага рэгёна і горада Барысава

## *(з найстаражытных часоў да сучаснасці)*

*(Працяг, пачатак у №10-12 (175-177) за 2013 г., 1-12(178-189) за 2014 г. і 1-12(191-201) за 2015 г., 1-9(202-211) за 2016 г., 1-2(214-215), 4-12(217-225) за 2017 г., 1-11(226-236) за 2018 г., 1-2(238-239), 4-8(241-245), 10-12(247-249) за 2019 г., 1-2(250-251), 4-12(253-261) за 2020 г., 1(262), 3(264), 5(266) за 2021 г.)*

У публікацыях пра барысаўскія вытворчасці, якія дзейнічалі ў перыяд НЭПа, часам паказваўся памер заробку. У той час аплата працы налічалася па тарыфнай сетцы, якая дзялілася на 10 разрадаў для працоўных і 17 разрадаў для службоўцаў. Велічыня заробку залежала ад пачасовай або здзельнай аплаты працы, стажу і кваліфікацыі працоўнага, нормаў выпрацоўкі, прэміяльных выплат, умоў працы і г.д. Немалаважнае значэнне мела форма ўласнасці прадпрыемства і яго статус (мясцовае, рэспубліканскае або саюзнае значэнне), стаўка працоўнага, якая была прапісана ў калектыўнай дамове. Да ўвагі, у пачатку 1927 г. сярэдняя стаўка складала 40 руб. 86 кап. Калі казаць пра пэўныя прыклады, то памер зарплаты ў працоўных папяровай фабрыкі “Прафінтэрн” у студзені-сакавіку 1927 г. складаў:

– па 1-м разрадзе – 25 руб. 80 кап.;

– па 6-м (сярэднім) разрадзе – 45 руб. 80 кап.;

– па 9-м (высокім) разрадзе – 60 руб. 20 кап.

На шклозаводзе “Домбаль” у 1926/27 гаспадарчым годзе сярэдні заробак быў роўны 52 руб. 70 кап. Неабходна ўлічваць, што “Прафінтэрн” і “Домбаль” з’яўляліся індустрыяльнымі флагманамі. Тым часам лесапільны завод (знаходзіўся на тэрыторыі заводу агрэгатаў), які быў прылічаны да вытворчасцяў мясцовага значэння, у 1925-1927 г.г. плаціў сваім працоўным ад 13 да 25 руб. У цэлым да зыходу НЭПа сярэднемесячная заработная плата на фабрычна-заводскіх прадпрыемствах Барысаўскай акругі, што былі сканцэнтраваны пераважна ў акруговым цэнтры, не перавышала 50 руб. Шмат гэта або мала?

Сучасніку XXI стагоддзя цяжка меркаваць пра пакупніцкую здольнасць тагачасных зарплат і грашовых знакаў. Адзначым, што барысаўцам заробленае выдавалася чырвонцамі (Квіткі Дзяржаўнага банка СССР наміналам 1, 3 і 5 чырвонцаў узору 1924 г.; 1 чырвонец узору 1926 г.) і рублямі (Дзяржаўны Казначэйскі Квіток наміналам 1, 3 і 5 рублёў узору 1924 г.; 3 і 5 рублёў узору 1925 г.). У звароце таксама знаходзілася разменная манета вартасцю ад срэбнага рубля да меднай паўкапейкі.



*Адзін чэрвонец выпуска 1926 года.*



*Пяць рублёў 1925 года.*

Ніжэй прыведзены кошт некаторых прамысловых і сельскагаспадарчых тавараў у Барысаве па дадзеных “Статыстычнага лісткА” за красавік 1927 г.:

– жыта (16 кг) – 1,50 руб.;

– авёс (16 кг) – 1,65 руб.;

– ячмень (16 кг) – 1,60 руб.;

– пшаніца (16 кг) – 1,70 руб.;

– бульба (16 кг) – 40 кап.;

– масла (1 кг) – 2,40 руб.;

– дзясятак яйкаў – 70 кап.;

– ільняное насенне (16 кг) – 1,40 руб.;

– мука жытняя (1 кг) – 1,05 руб.;

– крупы грачаныя (1 кг) – 17 кап. у гандлёвай сетцы Цэнтральнага працоўнага кааператыва (ЦПК) і 17,5 кап. у прыватных крамнікаў;

– бохан жытняга (чорнага) хлеба – 10 кап.у крамах ЦПК і 12 кап. у прыватных крамнікаў;

– бохан пшанічнага (белага) хлеба – 31 кап. у крамах ЦПК і 34 коп. у прыватных крамнікаў;

– свіное сала (1 кг) – 1,20 руб. у крамах ЦПК і 1,25 руб. у прыватных крамнікаў;

– мяса ялавічыны (1 кг) – 55 кап.;

– алей сланечнікавы (1 кг) – 58 кап. у крамах ЦПК і 67 кап. у прыватных крамах;

– селядзец прасолены (1 кг) – 59 кап. у крамах ЦПК і 63 кап. у прыватных крамнікаў;

– соль (1 кг) – 5,25 кап. у крамах ЦПК і 6 кап. у прыватных крамнікаў;

– цукар рафінад (1 кг) – 72 кап. у крамах ЦПК і 75 кап. у прыватных крамнікаў;

– цукар пясок (1 кг) – 62 кап. у крамах ЦПК і 63 кап. у прыватных крамнікаў;

– газа (1 кг) – 12 кап. у крамах ЦПК і 15 кап. у прыватных крамнікаў;

– мыла гаспадарчае (1 кг) – 60 кап. у крамах ЦПК і 63 кап. у прыватных крамнікаў;

– махорка ў пачках па 50 гр. – 7 кап.;

– паркалёвая тканіна (1 м) – 44 кап. у крамах ЦПК і 52 кап. у прыватных крамнікаў;

– пара ялавых ботаў – 18 руб.;

– жалезны метал (100 кг) – 19 руб. у крамах ЦПК і 22 руб. у прыватных крамнікаў;

– дахавае жалеза (100 кг) – 34 руб., 16 кап. у прыватных крамнікаў;

– цвікі (1 кг) – 29 кап. у крамах ЦПК і 33 кап. у прыватных крамнікаў;

– шкло аконнае (ліст) – 60 кап. у крамах ЦПК і 72 кап. у прыватных крамнікаў;

– сена (16 кг) -ад 70 да 80 кап. у залежнасці ад выгляду;

– авечка – 9 руб.;

– конь – 120 руб.

Звяртае ўвагу розны кошт на аднолькавы тавар у кааперытыўных гандлёвых кропках і прыватных крамах. Справа ў тым, што ЦПК, які абслугоўваў пераважна працаўнікоў, выстаўляў фіксаваныя кошты на тавары, у тым ліку з разраду дэфіцытных. Нягледзячы на ўвоз у рэспубліку вялікай колькасці тэкстылю, металу і металавырабаў, солі, цукру, газы, тытунёвых вырабаў, шкла і г.д. іх забеспячэнне не паспявала за попытам, які павялічваўся. У справаздачы Барысаўскага акруговага выканкама за 1926 г. прама паведамляецца, што попыт насельніцтва на тканіны, вырабы з жалеза, шыбу, падэшвенную абутковую скуру, алей і шматлікае іншае “задавальняўся толькі на 40-60%”. Нормай жыцця становяцца перабоі з забеспячэннем прадуктамі харчавання і таварамі першай неабходнасці, якія ўваходзілі ў так званы бюджэтны набор, які павінен быў задавальняць найбольш важныя жыццёвыя запатрабаванні працаўніка грамадзяніна ў СССР. Да ўвагі, набор уключаў 24 віды тавараў (прадукты харчавання, прадметы першай неабходнасці, сельскагаспадарчыя прадукты, прамысловыя тавары і дровы). У той жа справаздачы выканкама канстатуецца недахоп “шэрагу неабходных тавараў: сукна, галёшаў, масла, алею, вотруб’я, круп, мыла, селядцоў і нават мучных прадуктаў”. У практыку ўваходзіць браніраванне працоўнымі неабходнага тавару і яго купля ў крэдыт. Аднак гэтым прывілеем валодалі толькі пайшчыкі ЦПК. Паміж тым у прыватных гандлёвых кропках набыць практычна ўвесь дэфіцытны асартымент можна было свабодна, але па коштах, натуральна, вышэй. Пралетарыят не мог сабе дазволіць такую раскошу.

Статыстычныя дадзеныя таксама сведчаць, што сельскагаспадарчая прадукцыя ў Барысаве прадавалася даражэй, чым на мясцовых рынках, дзе, да прыкладу, тая ж ялавічына каштавала на 10-13 коп. танней. І наадварот, прамтавары (фабрычныя тканіны, металавырабы, будаўнічыя матэрыялы і г.д.) у гарадскіх гандлёвых кропках каштавалі танней, чым у сельскіх. Зрэшты, падобная коштавая неадпаведнасць захоўваецца і сёння.

*(Працяг будзе)*

***Аляксандр Балябін,***
*гісторык-археограф ДУК “Барысаўская цэнтральная раённая бібліятэка імя І.Х.Каладзеева”*